УДК 2(476)

*В. У. Старасценка*

# МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ У РЭЛІГІЙНЫМ ВЫМЯРЭННІ

**Анатацыя.** Разглядаюцца асаблівасці сучаснай рэлігійнай сітуацыі ў Магілёўскай вобласці Рэспублікі Беларусь, спецыфіка яе канфесійнага структуравання, тэндэнцыі і дынаміка развіцця ў кантэксце рэспубліканскай канфесійнай прасторы ў перыяд 2000-х гг.
**Ключавыя словы**: рэлігія, Магілёўская вобласць, канфесія, хрысціянства, рэлігійная абшчына, канфесійныя працэсы, рэлігійна-царкоўны рэнесанс, Беларуская праваслаўная царква.

У сферы рэлігійнага жыцця Беларусі на мяжы XX–XXI стст. склаўся не пазбаўлены супярэчнасцей феномен «рэлігійна-царкоўнага рэнесансу», які знайшоў адлюстраванне ў росце фармальнай рэлігійнай самаідэнтыфікацыі насельніцтва, павелічэнні колькасці канфесій і колькасці дзеючых рэлігійных абшчын, узмацненні ўплыву рэлігіі на сацыяльныя працэсы. Сярод актуальных праблем сучаснага рэлігіязнаўства асаблівае значэнне мае «аналіз рэлігійнай спецыфікі рэгіёнаў краіны» [3, с. 543].

Найбольш відавочнай праявай «рэлігійна-царкоўнага рэнесансу» стала істотнае павелічэнне колькасці рэлігійных арганізацый. У сучаснай Магілёўскай вобласці па стане на пачатак 2019 г. у складзе 21 канфесіі дзейнічала 291 рэлігійная абшчына [1]. У параўнанні з 1992 г., калі адбылася легалізацыя значнай колькасці абшчын, якія дзейнічалі да гэтага часу дэ-факта, іх колькасць павялічылася ў 4,7 разы, а колькасць канфесій – у 3,5 разы.

Канфесійныя працэсы ў Магілёўскай вобласці ў 1990-я гг., у параўнанні з 2000-мі гг., адрозніваліся большай дынамічнасцю. Калі на 1990-я гг. даводзіцца рэгістрацыя 179 рэлігійных абшчын, то на першае дзесяцігоддзе 2000-х гг. – 89, за восем гадоў другога дзесяцігоддзя 2000-х гг. – 22. Найбольш значны рост рэлігійных арганізацый у вобласці (60 абшчын) прыйшоўся на 1992 г. З 2000 г. назіраецца зніжэнне станоўчай дынамікі росту. Калі ў 1998 г. і 1999 г. ствараліся па 20 рэлігійных абшчын, то з 2000 г., як правіла, не больш за 10, у тым ліку з 2012 г. – не больш за чатыры абшчыны ў год. Калі за пяцігадовы перыяд 1989–1993 гг. былі зарэгістраваны 78 абшчын, то за 1994–1998 гг. – 71, за 1999–2003 гг. – 56, за 2004–2008 гг. – 43, за 2009–2013 гг. – 32, а за 2014–2018 гг. – 10. Тэмпы росту колькасці абшчын знізіліся, такім чынам, больш чым у 8 разоў. Падобны вектар дынамікі развіцця быў характэрны і рэспубліцы ў цэлым, і яе ўсходняму рэгіёну [11].

У параўнанні з іншымі абласцямі краіны Магілёўшчына традыцыйна адрозніваецца найменшай канфесійнай актыўнасцю [11, с. 91; 15, с. 174]. Прадстаўленыя тут на пачатак 2019 г. рэлігійныя арганізацыі складаюць менш за 9 % ад іх агульнай колькасці ў Беларусі. Пры гэтым на тэрыторыі вобласці пражывае каля 11 % насельніцтва краіны. У параўнанні з іншымі абласцямі

рэспублікі ў Магілёўскай вобласці найменшая колькасць культавых будынкаў (196 з 2684, гэта значыць каля 7 %) і найменшая колькасць святароў (252 з 3365, гэта значыць каля 7 %) [1]. Наадварот, большай рэлігійнай актыўнасцю адрозніваюцца заходні і цэнтральны рэгіёны – Брэсцкая і Мінская вобласці [10, с. 26, табл. 4].

Пры гэтым удзельная вага рэлігійных абшчын Магілёўскай вобласці ў агульнай колькасці рэлігійных абшчын Беларусі не з'яўлялася ў 1990–2000-х гг. статычным паказчыкам, яна павялічылася больш чым у 2 разы. Так, калі на пачатак 1993 г. абшчыны вобласці складалі 4,1 % агульнай сукупнасці рэлігійных абшчын рэспублікі, то на пачатак 1996 г. – 5,1 %, 1999 г. – 6,2 %. На пачатак 2003 г. – 7,05 %, 2009 г. – 8,13 %, 2019 г. – 8,62 %. У 2000-я гг. у агульнарэспубліканскай сукупнасці рэлігійных абшчын скарацілася ўдзельная вага абшчын Брэсцкай (на 2 %) і Гродзенскай (на 3 %) абласцей і, наадварот, павялічыўся сегмент Віцебскай (на 2 %), Гомельскай (на 1 %) і Магілёўскай (на 2 %).

На сучасным этапе ў Магілёўскай вобласці захоўваецца высокая ступень стабільнасці канфесійнай структуры. Значны рост агульнай колькасці канфесій прыпаў на 1990-я гг. Колькасць рэлігійных напрамкаў павялічылася з 1 у 1990–1991 гг. да 6 у 1992 г., 10 у 1994 г., 15 у 1997 г., 17 у 2000 г., 18 у 2004 г., 19 у 2006 г., 20 з 2012 г., 21 у 2018 г. Буйныя канфесіі вобласці, якія маюць цяпер больш за 10 абшчын, былі інстытуалізаваны ўжо ў 1992 г. Пасля 2000 г. прайшлі ўсталяваную працэдуру дзяржаўнай рэгістрацыі толькі чатыры канфесіі, якія маюць толькі па адной абшчыне: прэсвітэрыяне (2004), мармоны (2005), армяна-грыгарыяне (2012) і месіянскія абшчыны (2018). У параўнанні з рэспубліканскай канфесійнай структурай у цэлым, у Магілёўскай вобласці адсутнічаюць зарэгістраваныя арганізацыі каталікоў лацінскага абраду, рэфарматаў, будыстаў і хрысціян веры апостальскай.

У канфесійнай прасторы вобласці найбольш трывалыя пазіцыі па колькасці рэлігійных арганізацый займаюць Беларуская праваслаўная царква (БПЦ), Хрысціяне веры евангельскай (ХВЕ), Евангельскія хрысціяне-баптысты (ЕХБ) і Рымска-каталіцкая царква (РКЦ). Для параўнання: у Беларусі ў цэлым у крыху іншым парадку: БПЦ, ХВЕ, РКЦ і ЕХБ. Пры гэтым усе без выключэння найбольш значныя канфесіі вобласці маюць у канфесійнай структуры рэспублікі ўдзельную вагу, якая ўступае асераднёнаму рэгіянальнаму паказчыку [10, с. 28].

Найбольш стабільную станоўчую дынаміку развіцця як у рэспубліцы ў цэлым [6, с. 69] і яе ўсходнім рэгіёне [7, с. 92], так і ў Магілёўскай вобласці мае БПЦ. Калі ў 1990 г. яна налічвала 1 зарэгістраваны прыход, то на пачатак 1993 г. – 46, 1998 г. – 62, 2004 г. – 91, 2008 г. – 107, 2013 г. – 129, а на 1 студзеня 2019 г. – 137. Пры гэтым у агульным аб'ёме рэлігійных абшчын вобласці доля БПЦ у канкурэнтных умовах першага дзесяцігоддзя суверэннай Беларусі нават зменшылася з 74,2 % (на 1 студзеня 1992 г.) да 40,0 % (на 1 студзеня 2001 г.), але затым, у прэферэнтных умовах 2000-х гг., узрасла

да 47,1 % (на 1 студзеня 2019 г.). Іншая праваслаўная канфесія – стараабрадніцтва – з 2000 г. і да 2011 г. не мела станоўчай дынамікі росту колькасці абшчын (3 абшчыны – у 1999 г., 6 – з 2000 г. да 2011 г., 7 – з 2012 г.). У агульным аб'ёме рэлігійных арганізацый вобласці доля канфесіі ў 2000-х гг. нават паменшылася з 3,5 % (2000 г.) да 2,4 % (з 2017 г.) [9, с. 145].

Істотна за гады суверэннай Беларусі павялічылася ў Магілёўскай вобласці колькасць абшчын РКЦ (на пачатак 1993 г. – 3, на пачатак 1997 г. – 11, 1999 г. – 15, 2008 г. – 22, з 2009 г. і па цяперашні час – 23). Аднак калі першапачаткова доля абшчын РКЦ у агульным аб'ёме рэлігійных арганізацый вобласці павялічылася з 4,4 % (на 1 студзеня 1993 г.) да 10,0 % (на 1 студзеня 2000 г.), то за наступны перыяд зменшылася да 8,1 % (на 1 студзеня 2015 г.) [5, с. 98, табл. 64] і 7,9 % (на 1 студзеня 2019 г.). Калі ў 1990-х гг. штогадовы прырост РКЦ складаў у сярэднім 2 абшчыны, то ў 2000-х гг. – у сярэднім менш за 1. Доля ўніяцтва ў канфесійнай прасторы вобласці – каля 0,3 %.

Ранні пратэстантызм у форме лютэранства прызнаецца ў рэспубліцы «традыцыйнай» рэлігіяй, але не стаў сур'ёзным фактарам канфесійнага жыцця. Першая суполка лютэран была зарэгістраваная ў 2000 г., з 2006 г. дзейнічаюць 4 арганізацыі. У агульным аб'ёме рэлігійных арганізацый вобласці лютэранства павялічыла сваё прадстаўніцтва ў 2000-я гг. з 0,56 % да 1,37 %. Іншая форма ранняга пратэстантызму – прэсвітэрыянства – мае з 2004 г. у вобласці адну абшчыну, адзіную ў Беларусі.

Найбольш дынамічнай канфесіяй па росце колькасці рэлігійных абшчын як у Рэспубліцы Беларусь, так і ў Магілёўскай вобласці да пачатку 2000-х гг. з'яўляўся позні пратэстантызм. Колькасць яго напрамкаў павялічылася з 4 (ЕХБ, ХВЕ, АСД, Сведкі Іеговы) у 1992 г. да 7 у 1995 г., 8 у 2005 г. і 9 у 2018 г. Колькасць абшчын за той жа перыяд вырасла больш чым у 7 разоў – з 13 да 98, і яны складаюць каля 34 % у агульным аб'ёме рэлігійных арганізацый вобласці. Найбольшую колькасць абшчын маюць пяцідзесятніцтва і баптызм [4, 12, 13].

З нехрысціянскіх рэлігій заслугоўвае ўвагі дынаміка развіцця артадаксальнага юдаізму. На пачатак 1994 г. рэгістрацыю мела адна абшчына гэтай рэлігіі, што складала 1,3 % ад агульнага аб'ёму рэлігійных арганізацый вобласці. Удзельная вага артадаксальнага юдаізму ў наступныя гады павялічылася з 2 % (на 1 студзеня 1999 г.) да 4,8 % (на пачатак 2019 г.). Абшчыны «прагрэсіўнага юдаізму», заняўшы ў 1998 г. 1,3 % канфесійнай прасторы вобласці, у далейшым знізілі сваю прысутнасць амаль удвая: да 0,69 % на пачатак 2019 г. Новыя рэлігійныя рухі («новыя рэлігіі»), якія атрымалі пэўны распаўсюд у постсавецкай Беларусі, на Магілёўшчыне прадстаўлены двума, як і ў Беларусі ў цэлым, легалізаванымі кірункамі – адзінкавымі суполкамі Міжнароднага таварыства свядомасці Крышны і Бахаі.

Пры аналізе рэлігійнай сітуацыі асаблівай увагі заслугоўвае ўзровень рэлігійнасці насельніцтва. Апошняе па часе даследаванне па сацыялогіі рэлігіі

было праведзена ў Магілёўскай вобласці ў 2018 г. (Н. В. Новікава, М. Я. Ліхачоў, С. М. Ліхачова і інш.) [2, 6]. Яно паказвае высокі ўзровень фармальнай рэлігійнай самаідэнтыфікацыі: большасць рэспандэнтаў (73,4 %) заявіла, што лічыць сябе «вернікамі». Адначасова сацыёлагі выяўляюць ярка выяўленую дэкларатыўнасць рэлігійнай веры. Сярод тых, хто заявіў пра сваю «веру», толькі 19 % паведаміла, што «вераць і выконваюць рэлігійныя абрады» [2, с. 18]. У цэлым пацвярджаецца раней фармуляваная выснова, што сацыялагічныя дадзеныя ставяць пад сумнеў сапраўднасць рэлігійнай веры, якая маніфестуецца рэспандэнтамі. Тыя, хто ідэнтыфікуе сябе з «вернікамі», дэманструюць рэлігійна-светапоглядны эклектызм, галоўным чынам павярхоўнае веданне веравучальных тэкстаў. Гэтыя і іншыя матэрыялы сведчаць аб «рэлігійнасці па традыцыі», а не рэлігійнасці ва ўласным сэнсе гэтага слова, што абумовіла ўжыванне паняцця «секулярны (партыкулярны) вернік» для абазначэння асобы, якая толькі дэкларуе сябе вернікам, але не жыве царкоўным жыццём. Падобная сітуацыя назіраецца і ў моладзевым асяроддзі [8, 14].

Пры ўсёй нетоеснасці сацыялагічных дадзеных аб рэлігійнасці насельніцтва як Магілёўшчыны, так і Беларусі ў цэлым можна сцвярджаць аб вядомай палярызацыі адносін да рэлігіі. У рэгіёне, як і ў іншых абласцях і ў рэспубліцы ў цэлым, адсутнічае абсалютнае дамінаванне якой-небудзь адной канфесіі. Характэрна для Магілёўшчыны і значнае зніжэнне тэмпаў штогадовага прыросту колькасці рэлігійных арганізацый пры адначасовым павелічэнні ўдзельнай вагі абшчын рэгіёну ў іх агульнай колькасці ў Рэспубліцы Беларусь. Ва ўмовах веравызнаўчага плюралізму ў грамадскай свядомасці, які дапаўняецца развітой поліканфесійнай структурай краіны, асаблівую актуальнасць набывае ажыццяўленне навукова абгрунтаванай дзяржаўнай палітыкі ў галіне свабоды сумлення, якая прадугледжвае рэалізацыю замацаванага ў нацыянальным заканадаўстве права грамадзян як на свабоду веравызнання, так і на свабоду атэізму ў мэтах фармавання агульнаграмадзянскай, а не канфесійнай ідэнтычнасці.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Архив Главного управления идеологической работы и по делам молодежи Могилевского областного исполнительного комитета.

2. Религиозные воззрения как фактор духовности жителей Могилевской области: социологический анализ: отчет / Отдел социологических исследований и информационно-аналитической работы КИУП «Информационное агентство «Могилевские ведомости»; Н. В. Новикова [и др.]. – Могилев, 2018. – 50 с.

3. **Старостенко, В. В.** Актуальные проблемы современного религиоведения в Беларуси / В. В. Старостенко // Национальная философия в глобальном мире: тез. Первого Белорус. филос. конгр. – Минск, 2017. – С. 542–543.

4. **Старостенко, В. В.** Динамика развития и особенности структуры Христиан веры евангельской в восточной Беларуси в период 2000-х гг. / В. В. Старостенко // Весн. МДУ імя А. А. Куляшова. Сер. А. Гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2020. – № 1 (55). – С. 81–86.

5. **Старостенко, В. В.** Католицизм на современном этапе развития белорусского общества (религиоведческий анализ): монография / В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2018. – 168 с.

6. **Старостенко, В. В.** О некоторых особенностях современной религиозности населения Могилевщины / В. В. Старостенко // Итоги научных исследований ученых МГУ имени А. А. Кулешова 2018 г.: материалы науч.-метод. конф. – Могилев, 2019. – С. 38–40.

7. **Старостенко, В. В.** Особенности региональной структуры и динамика развития Белорусской православной церкви в восточной Беларуси в 2000-х гг. / В. В. Старостенко // Весн. МДУ імя А. А. Куляшова. Сер. А. Гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2019. – № 2 (54). – С. 91–97.

8. **Старостенко, В. В.** Особенности самоопределения в отношении религии в современной молодежной среде (на примере студенчества Могилевщины) / В. В. Старостенко // Весн. МДУ імя А. А. Куляшова. Сер. А. Гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2016. – № 1 (47). – С. 70–73.

9. **Старостенко, В. В.** Региональная структура старообрядчества в восточной Беларуси в 2000-х гг.: особенности и динамика развития / В. В. Старостенко // Религия и общество – 13: сб. науч. ст. – Могилев, 2019. – С. 141–146.

10. **Старостенко, В. В.** Религиозная ситуация в Могилевской области / В. В. Старостенко. – Могилев: Могилевский облисполком, 2019. – 68 с.

11. **Старостенко, В. В.** Специфика конфессионального пространства восточного региона Республики Беларусь / В. В. Старостенко // Романовские чтения – 13: сб. ст. Междунар. науч. конф. – Могилев, 2019. – С. 90–91.

12. **Старостенко, В. В.** Структура протестантизма в восточном регионе современной Беларуси / В. В. Старостенко // Религия и общество – 12: сб. науч. ст. – Могилев, 2018. – С. 176–179.

13. **Старостенко, В. В.** Христиане полного евангелия в восточной Беларуси: особенности и динамика развития региональной структуры (2000-е гг.) / В. В. Старостенко // Религия и общество – 13: сб. науч. ст. – Могилев, 2019. – С. 193–198.

14. **Юдин, В. В.** Особенности религиозности молодежи восточных регионов Беларуси / В. В. Юдин. – Минск: БГУ, 2009. – 150 с.

15. **Старасценка, В. У.** Асаблівасці рэгіянальнай канфесійнай структуры на беларускім памежжы (Гомельская і Гродзенская вобласці) / В. У. Старасценка // Российско-белорусское пограничье: языковые и социокультурные аспекты взаимодействия: материалы Междунар. науч.-практ. конф. – Могилев, 2021. – С. 174–179.